# Краіна здароўя

Выпуск № 6 (120)

## Цвярозы люты пачаўся з Драгічына

У Драгічынскім раёне правялі дзень цвярозасці. Як расказала старшыня раённага Савета дэпутатаў Ганна Верамейчык, ініцыятыва нарадзілася на раённым сходзе старастаў вёсак. Другім ініцыятарам стаў райаддзел міліцыі. Рашэннем райвыканкама рэкамендавалі ўсім гандлёвым арганізацыям устрымацца ў гэты дзень ад продажу спіртных напояў. Калі хто прыходзіў у краму і прасіў гарэлкі ці віна, яму выдавалі лістоўку, дзе падрабязна тлумачылася сутнасць акцыі, а таксама расказвалася аб негатыўных наступствах п'янства і алкагалізму.

Паводле слоў **начальніка ідэалагічнага аддзела райвыканкама Таццяны МАСЮК,** за распаўсюджванне лістовак актыўна ўзяліся члены БРСМ. З самага ранку маладыя людзі ўручалі прахожым на вуліцах райцэнтра лістоўкі, маляўнічыя буклеты і памяткі пра шкоду п'янства. Такія ж лістоўкі ўручалі кіроўцам супрацоўнікі ДАІ, а заадно праводзілі гутаркі пра безумоўнае выкананне правілаў паводзінаў на дарогах, гэта значыць, пра недапушчальнасць сядаць за руль на падпітку. І большасць людзей з разуменнем ставілася да акцыі. Бо перад гэтым вялікую прапагандысцкую работу правялі мясцовыя газета і тэлебачанне. На прадпрыемствы горада і раёна, у сельсаветы накіраваліся інфармацыйныя групы. У складзе іх былі медыкі і супрацоўнікі міліцыі, таму з членамі працоўных калектываў, з жыхарамі вёсак вялася прадметная размова, з прыкладамі мясцовага жыцця. У гэты ж дзень практычна ва ўсіх сельсаветах міліцыянеры наладзілі рэйд па выяўленні незаконных гандляроў самагонкай.

Асаблівую ўвагу арганізатары звярнулі на так званыя катэгоры рызыкі грамадзян. Так падлеткаў, якія стаяць на ўліку ў інспекцыі па справах няпоўнагадовых, запрасілі на адпраўку групы хранічных алкаголікаў у лячэбна-прафілактычную ўстанову. І на многіх гэта экскурсія ўсё ж зрабіла ўражанне, як вынікала з пазнейшай гутаркі. А ў сацыяльным прытулку для дзяцей быў наладжаны дзень адчыненых дзвярэй. І арганізатары пастараліся, каб туды «выпадкова» трапілі хоць некалькі рызыковых мам.

Гарэлкі, віна ў горадзе не прадавалі, а ўзамен прапанавалі спартыўныя залы, басейн, якія ў той дзень працавалі бясплатна. Спаборніцтвы па валейболе паміж камандамі БРСМ, РАУС і райбальніцы таксама сталі прыкладам здаровага ладу жыцця.

Пакуль ішлі спаборніцтвы і розныя мерапрыемствы, супрацоўнікі ідэалагічнага аддзела наладзілі апытанне грамадскай думкі на тэму дня. Былі прапанаваны два нумары тэлефона: на адзін запрашалі званіць тых, хто падтрымліваў ініцыятыву правядзення такога дня, на другі — хто быў супраць. Дык вось на другі нумар званкоў так і не паступіла. А на першы званілі... выключна жанчыны, дзякавалі і гаварылі, што практыку трэба прадоўжыць.

Па выніках дня цвярозасці ў раёне прайшло пасяджэнне «круглага стала», дзе сабраліся прадстаўнікі органаў улады, шырокай грамадскасці, святары. Але ўсе выказваліся за тое, што са злом трэба змагацца ўсёй грамадой, і асабліва актыўна змагацца за маладыя душы.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Асіповіцкі школьнік Віталь ГРЫБАЎ на занятках.

## Колькасць абортаў сярод моладзі да 19 гадоў у Беларусі за год скарацілася больш чым у пяць разоў

**Пра гэта карэспандэнту БЕЛТА паведаміла намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі Святлана ШЫЛАВА.**

Паводле яе слоў, у 2008 годзе агульная колькасць абортаў у Беларусі скарацілася больш чым у паўтара раза і, паводле звестак Міністэрства аховы здароўя, склала амаль 26 тыс. З іх 788 абортаў было зроблена моладзі ва ўзросце да 19 гадоў. У 2007 годзе ў дзяржаўных установах аховы здароўя было зроблена каля 44 тыс. абортаў, з іх каля 4 тыс. моладзі да 19 гадоў. «Гэта сведчыць пра тое, што праграмы, якія рэалізуюцца ў Беларусі ў гэтай сферы, маюць станоўчы вынік», — адзначыла яна.

Парламентарый таксама адзначыла, што ў Беларусі добрыя паказчыкі дэмаграфічнай бяспекі. Так, за апошнія тры гады мацярынская смяротнасць у рэспубліцы знізілася з 17,4 на 100 тыс. жываннароджаных дзяцей да 2,8. Такім чынам, грошы, якія былі выдзелены на рэканструкцыю і пераасанашчэнне радзільных дамоў, умацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы медустаноў, развіццё перынатальных цэнтраў — усё гэта дазволіла максімальна знізіць мацярынскую і дзіцячую смяротнасць. «Па гэтых галоўных дэмаграфічных паказчыках Беларусь стаіць на ўзроўні развітых краін свету», — падкрэсліла Святлана Шылава.

Акрамя таго, яна расказала, што для фарміравання здаровага ладу жыцця моладзі ў Беларусі створаны і дзейнічаюць 17 цэнтраў сяброўскага стаўлення да падлеткаў. Арганізацыя гэтых цэнтраў праходзіла пры дапамозе СААЗ. Любы падлетак і яго бацькі могуць звярнуцца ў гэтыя цэнтры, дзе ім прафесійна дапамогуць псіхолаг, акушэр-гінеколаг, уролаг, эндакрынолаг. Напрыклад, у Мінску ў цяперашні час існуюць пяць такіх цэнтраў, лепшыя з якіх дзейнічаюць на базе 8-й дзіцячай паліклінікі. Цэнтры таксама створаны ў Салігорску, Маладзечне і іншых гарадах рэспублікі. «Асноўныя намаганні цэнтраў сяброўскага стаўлення да падлеткаў накіраваны на прафілактыку абортаў, інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам, а таксама на псіхалагічную дапамогу, у якой могуць мець патрэбу падлеткі. Яны часам уваходзяць у агрэсіўны і дэпрэсіўны стан, і з імі трэба гутарыць, дапамагчы выйсці з гэтай сітуацыі», — патлумачыла Святлана Шылава.

Інфарм-укол

### НАВОШТА МЕРЗНУЦЬ?

**Вы можаце зрабіць некалькі рэчаў, каб пазбегнуць пераахаладжэння ці нават абмаражэння.**

1. Не прамакайце. Цела хутчэй страчвае цеплыню, калі скура мокрая ад дажджу, снегу ці поту.

2. Абараняйце сябе ад ветру. Вецер адбірае цеплыню ў цела. Неабароненая скура асабліва ўразлівая і можа замерзнуць літаральна за хвіліны, калі вецер спалучаецца з нізкімі тэмпературамі. Вось прыклад уздзеяння ветру. Тэмпература на вуліцы -29 °С у спалучэнні з ветрам хуткасцю 16 км у гадзіну або 4,5 метра ў секунду паніжаецца да -43 °С.

3. Апранайце цёплае адзенне. Выбірайце тое, што абараняе і дыхае. Слаі лёгкага свабоднага адзення затрымліваюць паветра, што служыць ізаляцыяй. У якасці верхняга адзення насіце што-небудзь воданепранікальнае і абароненае ад ветру.

4. Закрывайце галаву, шыю і твар. Вялікая колькасць цеплыні арганізма страчваецца пры страце яго з паверхні галавы. Насіце шапку.

5. Апранайце цёплыя шкарпэткі і рукавіцы. Калі вы будзеце знаходзіцца на холадзе, марозе некалькі хвілін, выкарыстоўвайце дзве пары шкарпэтак. Таксама надзявайце рукавіцы, якія абараняюць пальцы лепей за пальчаткі.

6. Звяртайце ўвагу на анямenne. Калі частка вашага цела змерзла так, што амаль знямела, значыць, вы на шляху да абмаражэння. Патрацьце некаторы час, каб сагрэцца.

### ТРЫВОЖНЫЯ СІГНАЛЫ — ПЕРАД ВАЧЫМА

**Успышкі святла, чорныя плямы, недакладнае ўспрыняцце прадметаў... Калі вы адносіцеся да 15 працэнтаў асобаў, у якіх прыступы мігрэні суправаджаюцца гэтымі сімптомамі, — гэта сігнал аб магчымай сур'ёзнай небяспецы.**

У маладых жанчын з такім тыпам мігрэні на 50 працэнтаў вышэйшая рызыка інсульту (калі згустак крыві перакрывае сасуд у галаўным мозгу), сцвярджаюць замежныя вучоныя. Спецыялісты раяць расказаць пра гэтыя сімптомы свайму доктару. Акрамя таго, варта ўзгадаць пра 30 хвілін фітнэсу штодня і развітанне з курэннем.

### ПРАСТУДЗІЛІСЯ? АДПАЧЫВАЙЦЕ

**Прыкладна палову ўсіх непрацяглых захворванняў складаюць прастудныя інфекцыі або іншыя тыпы рэспіраторных захворванняў — круп, фарынгіт, ларынгіт ці бранхіт.**

Насмарк, чханне, слёзацячэнне, боль у горле, асіпласць, кашаль, невысокая тэмпература, якая можа суправаджацца дрыжыкамі і мышачным болем, галаўны боль, агульнае дрэннае самаадчуванне — вось асноўныя прыкметы прастуднага стану. Калі захворванне працягваецца звыш 2 тыдняў, абавязкова звярніцеся да ўрача, каб пераканацца ў адсутнасці другаснай бактэрыяльнай інфекцыі лёгкіх, гартані, трахеі, прыдатачных пазух або вушэй.

Вядома звыш 200 тыпаў вірусных штамаў, здольных выклікаць рэспіраторныя інфекцыі. Да іх ліку адносяцца рынавірусы — група вірусаў, часцей за ўсё звязаная з так званай звычайнай прастудай, якая паражае найперш нос і горла.

Прастудныя інфекцыі распаўсюджваюцца двума шляхамі. Найбольш часты — прамы кантакт з заражанымі выдзяленнямі. Дастаткова паціснуць руку чалавеку, які высмаркаўся ў насавы платок або пакашляў у руку, каб атрымаць ад яго вірус. Другі шлях — чханне і кашаль, калі вірусы трапляюць у паветра, а адтуль — іншым людзям. Гэты метад заражэння менш эфектыўны. Шырока распаўсюджана меркаванне, што прастудзіцца можна, калі прамачыў ногі або пасядзеў на скразняку. Лічыцца, што прастудзе спрыяе недахоп сну і стомленасць. Аднак клінічныя выпрабаванні не пацвердзілі абсалютную ролю гэтых фактараў ва ўзнікненні прастудных хваробаў. Аднак калі вы ўжо захварэлі, то перш за ўсё падчас прастуды неабходна больш адпачываць.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

### «Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25

<u>3 сакавіка:</u>

**9.00 — 12.00** — галоўны ўрач Мінскай абласной клінічнай бальніцы Юрый Мікалаевіч Ладуцька

**14.00 — 17.00** — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Ігар Віктаравіч ЛАЗАРЧЫК.

<u>10 сакавіка:</u>

**9.00 — 12.00** — намеснік галоўнага ўрача Мінскага абласнога процітуберкулёзнага дыспансэра Вольга Леанідаўна ГАРЭНЮК.

**14.00 — 17.00** — загадчык кансультацыйна-метадычнага аддзялення Мінскага абласнога скурна-венералагічнага дыспансэра Вячаслаў Іванавіч РОСЛІК.

*У графіку магчымыя змяненні.*

## ПЯЦЬ ЗВЫЧАК СТРОЙНАСЦІ

1. Не карыстайцеся радыкальнымі метадамі пахудзення. Галаданне, монадыеты, дыеты з поўным выключэннем з рацыёну тлушчаў, бялкоў ці вугляводаў дапамогуць пазбавіцца ад лішніх кілаграмаў, але пасля вяртання да звычайнага рэжыму харчавання гэтыя кілаграмы вернуцца, прыхапіўшы з сабой пару-тройку сяброў. Да таго ж жорсткія абмежаванні ў харчаванні цягнуць за сабой сур'ёзныя парушэнні ў эндакрыннай, нервовай, палавой сістэмах.

2. Неабходна знайсці прычыну пераядання і пазбавіцца яе. Самота, напружанне на працы, канфлікт з бацькамі ці каханне без узаемнасці вельмі часта пераўтвараюцца ў непераадольнае жаданне пакласці што-небудзь у рот. І пакуль не ўдасца справіцца са сваімі праблемамі, гэта жаданне будзе вельмі цяжка, а часам і немагчыма пераадолець.

3. Пазбаўцеся ад звычкі есці перад тэлевізарам ці падчас чытання кнігі. Не падыходзьце да халадзільніка, калі захопленыя размовай па тэлефоне з лепшай сяброўкай. У такія моманты зусім не кантралюецца працэс яды, а адпаведна, можна адправіць у рот значна больш, чым трэба.

4. Ешце часта, але маленькімі порцыямі. Есці адзін раз на дзень з мэтай пахудзець не варта: арганізм хутка зразумее, што чарговай «падзапраўкі» яму даводзіцца чакаць вельмі доўга, і таму будзе засвойваць і эканоміць кожную калорыю. Калі ж есці 5-6 разоў на дзень патроху, арганізм прывыкае да гэтага і пачынае «ленавацца» — ведаючы, што яго ўсё роўна пакормяць праз пару гадзін, ён не так старанна назапашвае, тое, што з'едзена.

5. Старайцеся часцей хваліць сябе за дасягнутыя вынікі (але не прэміруйце шакаладкай ці торцікам!!!). Самаўнушэнне здольнае рабіць сапраўдныя цуды, і калі гаварыць сабе: «Якая я прыгажуня! Як я хутка худзею!», дасягненні і сапраўды будуць ашаламляльнымі!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

І апошняе — колькі б кілаграмаў ні паказвала стрэлка вагаў, трэба любіць сваё цела і даглядаць яго. Прыгожа адзетая пампушачка з бліскучымі валасамі, здаровай скурай і чароўнай усмешкай прывáблівае значна больш, чым худая, але недагледжаная жанчына!

**Ірына АНТОНАВА.**

На ўсякі выпадак

### БАРАЦЬБА З ПАХМЕЛЛЕМ

Пераспрабавана вялікая колькасць лекаў ад пахмелля, але вельмі мала звестак пра тое, што яны сапраўды дапамагаюць. А ад некаторых можа стаць толькі горш. Алкаголь абязводжвае, гэтаксама як і кававыя напоі, якія звычайна выкарыстоўваюць для барацьбы з пахмеллем.

**Лепей за ўсё:**

⇨ Адпачніце і выпіце шмат вадкасці без смаку, такой як вада, содавая, сокі з паніжанай кіслотнасцю і булён. Пазбягайце ўжывання напояў з лімоннай кіслатой і кафеінам.

⇨ Можаце прыняць ібупрафен або іншы безрэцэптурны сродак для абязбольвання.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Мужчыны, увага!

## НАРАДЖЭННЕ ЗДАРОВАГА НАСЛЕДНІКА ЗАЛЕЖЫЦЬ І АД ВАС

**Планаванне цяжарнасці — першы крок на шляху да нараджэння здаровага дзіцяці. Усім хочацца, каб гэты шлях быў напоўнены радасным чаканнем, новымі адчуваннямі і прыемнымі адкрыццямі. Залогам спакойнага працякання цяжарнасці і здароўя нованароджанага становіцца здароўе абаіх бацькоў.**



Пра здароўе будучых мам гавораць часта і шмат. Аднак і фізічны стан будучага бацькі тут не менш важны. Нездаровы лад жыцця, згубныя звычкі, праца на шкоднай вытворчасці — гэтыя і многія іншыя фактары ўплываюць на рэпрадукцыйную функцыю мужчыны. Таму, калі вы цвёрда вырашылі стаць бацькам, ведайце, што ўсе аздараўляльныя мерапрыемствы варта пачынаць хоць бы за 2,5—3 месяцы да зачацця. Менавіта столькі часу выспяваюць сперматазоіды.

Такім чынам, каб зачаць здаровае дзіця, **ВАРТА:**

■ прайсці комплекснае медыцынскае абследаванне;

■ старацца ахоўваць свой арганізм ад інфекцый (ВРЗ, грып і г.д.); пры неабходнасці прайсці дадатковы курс павышэння імунітэту і не забываць пра сродкі прафілактыкі;

■ не забывацца і пра захворванні, якія перадаюцца палавым шляхам (ганарэя, хламідыёз, вірус герпесу і інш.). Яны могуць стаць прычынай не толькі мужчынскай бясплоднасці, але і развіцця паракаў у плода, невыношвання цяжарнасці. Каварства гэтых захворванняў у тым, што часта яны працякаюць скрыта, нічым сябе не праяўляючы. Гэтыя інфекцыі прыводзяць да пашкоджання сперматазоідаў актыўнымі радыкаламі і іншымі фактарамі запалення, утварэння спаек на шляху сперматазоідаў, развіцця імунных рэакцый супраць уласных сперматазоідаў. Калі лячэнне пачата своечасова, парушэнні якасці спермы звычайна абарачальныя. Таму спачатку неабходна старраннае абследаванне і кваліфікаванае лячэнне, а затым ужо — зачацце;

■ па магчымасці не прымаць ніякіх лекаў, а пры неабходнасці абавязкова пракансультавацца з урачом аб бяспецы лекаў з пункту гледжання вашага будучага бацькоўства;

**ВЫКЛЮЧЫЦЬ**

...курэнне і алкаголь. Апошні аказвае такое ж згубнае ўздзеянне на мужчынскую рэпрадукцыйную сістэму, як і на жаночую. І алкаголь, і нікацін прыводзяць да змяншэння выпрацоўкі мужчынскіх палавых гармонаў і зніжэння колькасці і жыццяздольнасці сперматазоідаў;

...наркотыкі. Яны не толькі зніжаюць выпрацоўку сперматазоідаў, але і ўносяць істотныя змены ў генетычную інфармацыю, якая перадаецца ад бацькі;

**АБМЕЖАВАЦЬ** фізічна цяжкую працу, гэта можа адмоўна адбіцца на апладняльнай функцыі спермы;

**ПАЗБЯГАЦЬ** стрэсаў (урачы лічаць іх асноўнымі віноўнікамі мужчынскага бясплоддзя);

**АДМОВІЦЦА**

...ад наведвання лазні, саўны, прыёму гарачых ваннаў. Прычына ў тым, што для добрага функцыянавання яечкаў і захавання нармальнай рухавасці сперматазоідаў неабходная камфортная тэмпература 35°С (на некалькі градусаў ніжэйшая за тэмпературу цела). Яны таму і знаходзяцца не ў брушной поласці, а ў спецыяльнай скурнай сумцы — машонцы;

...ад нашэння цеснай бялізны, джынсаў, а таксама ад празмернага захаплення рознымі відамі спорту, якія траўмуюць пахвінную вобласць (баявыя адзінаборствы, веласпорт і інш.);

**АБМЕЖАВАЦЬ** кантакт з рознымі хімічнымі сродкамі (фарбавальнікі, лакі, растваральнікі на аснове вуглевадародаў, солі цяжкіх металаў), а таксама з крыніцамі іанізуючага выпраменьвання, ЗВЧ і рэнтгеналагічнымі праменямі, якія могуць сур'ёзна пагоршыць якасць спермы;

**ЗАХОЎВАЦЬ** дыету: давядзецца адмовіцца ад тлустай, салодкай і моцна салёнай ежы і есці як мага больш натуральных прадуктаў. У ідэале гэта павінна быць пяць порцый садавіны або агародніны штодзень, плюс мяса птушкі, рыба, морапрадукты, арэхі, малочныя прадукты, нерафінаваныя вугляводы, якія змяшчаюцца ў прадуктах з цэльнага зерня, хлебе, мюслях, макароне.

**УСТРЫМАЦЦА** ад палавога жыцця на працягу 3—6 дзён перад зачаццем, што павысіць аб'ём і апладняльную здольнасць спермы (больш доўгае ўстрыманне, насупраць, павышае колькасць старых, пераспелых формаў сперматазоідаў);

■ і самае галоўнае — мужчына павінен кахаць жанчыну, ад якой ён хоча мець дзіця.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Асоба

## ЗАЛАТЫ КЛЮЧЫК

**Напэўна, небам гэтай жанчыне было наканавана несці дабрыню і дарыць людзям надзею. Яе, дзяўчынку, якая нарадзілася напярэдадні Дня медработніка, так і назвалі — Надзея. Бацькоўскі дом знаходзіўся насупраць гарадскіх могілак, у дзяцінстве ёй неаднойчы даводзілася назіраць за людскім горам, якое прыносіла смерць. Тады дзяўчынка не раз лавіла сябе на думцы: як было б выдатна, калі б можна было дапамагчы гэтым людзям. Нават больш за тое, яна ўяўляла сабе, як завіхаецца ля ложка хворага, дапамагае яму і вырывае жыццё з рук смерці.**

Былі цяжкія пасляваенныя гады. Сямікласніцы Надзеі Клюнчык па сямейных абставінах давялося пакінуць школу. Сур'ёзна захварэла маці, а старэйшая сястра якраз выйшла замуж, таму Надзея мусіла ўскласці на сябе абавязкі гаспадыні. І толькі дзякуючы намаганням дырэктара дзяўчынка прадоўжыла вучобу ў вячэрняй школе. Настаўнікі адзначалі ў ёй здольнасці да матэматыкі, раілі пасля школы паступаць у педынстытут.

— Добра памятаю: сабрала дакументы, завезла іх у інстытут, а потым сяджу дома і сама сабе думаю: «А што, калі я буду настаўніцай і мне на ўроку раптам трапіцца задача, якую сама не змагу рашыць? Гэта ж які сорам будзе перад вучнямі!» Падумала, падумала так і вырашыла — не, не буду настаўнікам. На наступны дзень паехала і забрала дакументы, — расказвае Надзея Антонаўна.

Пасля гэтага яны разам з суседкай вырашылі завезці дакументы ў медвучылішча. Сяброўка, наглядзеўшыся плакатаў з апёкамі, якімі былі завешаны сцены ў вучылішчы, са словамі: «Надзька, тут так брыдка. Я не буду тут вучыцца», паехала дадому, а Надзея Антонаўна засталася. Падчас вучобы студэнтка-выдатніца Надзя атрымала мянушку «залаты ключык». І было гэта зусім невыпадкова.

— Я заўсёды старалася вучыцца, рыхтавалася да кожнага занятку. Памятаю, аднойчы па гісторыі праходзілі тэму «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм». Перачытала параграф — ну, нічога не разумею. Што рабіць? Ведаю ж, што мяне абавязкова выклічуць. Села і проста ўсё слова ў слова вывучыла напамяць. На занятку выкладчык выклікае аднаго — непадрыхтаваны, другога — таксама маўчыць. Гаворыць: «Ну, Надзька, давай ты». Я ўстала і ўсё, як па кніжцы выдала. Выкладчык слухае мяне, а сам піша ў журнал: «За сумленнае зубрэнне — выдатна». Вось так за сваю стараннасць і надзейнасць, а яшчэ і за дзявочае прозвішча Клюнчык, выкладчыкі і аднакурснікі называлі мяне залаты ключык, — узгадала жанчына.

Пасля двух гадоў вучобы, атрымаўшы дыплом «з адзнакай», перад Надзеяй Антонаўнай паўстаў выбар: ці ісці на працу, ці прадоўжыць вучобу ў ВНУ, куды, дарэчы, дзяўчыну прымалі без уступных іспытаў. Яе старэйшая сястра ў той час жыла ва Украіне, таму Надзея Антонаўна вырашыла паспрабаваць паступаць у Львоўскі медінстытут, але, даведаўшыся, што абавязкова давядзецца працаваць ва Украіне, перадумала. Вучыцца ж у Беларусі можна было толькі далёка ад дому, чаго не дазваляла матэрыяльнае становішча.

— Праўда, бацька, каб адправіць мяне вучыцца, прапаноўваў прадаць карову. А яе ж толькі купілі, бо тую, што была раней, падчас адступлення зарэзалі немцы. Для мяне гэта была вельмі высокая плата, таму вырашыла: папрацую, крыху падзараблю, а там відаць будзе, — дзеліцца жанчына.

Спачатку Надзею Антонаўну размеркавалі ў Велікарыту, потым перавялі ў Маларыту, а адтуль «часова, пакуль не прыедзе спецыяліст», накіравалі фельчарам у Пажэжын. А гэтае «часова» крыху зацягнулася: 18 кастрычніка было 50 гадоў, як Надзея Антонаўна жыве ў Масевічах, 47 з іх яна носіць прозвішча Мартынюк. Фельчарам жанчына працавала да 1992 года. За гэты час яна паспела абслужыць тры пакаленні пажэжынцаў: бацькоў, дзяцей і іх унукаў. Кожны з вяскоўцаў для яе як родны, таму яна амаль ніколі не прапускае першы і апошні званок у школе, вечар сустрэчы выпускнікоў. Яшчэ з першых дзён працы Надзея Антонаўна сваёй чуласцю і сумленнасцю заслужыла павагу пажэжынцаў.



**Напэўна, быць медыкам Надзеі Антонаўне МАРТЫНЮК было наканавана небам.**

— Калі мяне накіроўвалі ў Пажэжын, мая маці галасіла па мне, як па нябожчыку: «Божачка, божачка, куды ж цябе накіравалі. Там жа адны бандыты». Бо Пажэжын у пасляваенныя часы меў не самую лепшую рэпутацыю. І гэта было сапраўды так. Добра памятаю, як недзе ў першыя гады маёй працы тут забілі брыгадзіра. Мяне ж ніколі ніхто не чапаў. Вось, напрыклад, выклікалі мяне неяк ноччу да хворага. Іду па вёсцы, а насустрач — мужчына. Ён мяне заўважыў і валіць прамой наводкай на мяне, і рукі ўжо раскінуў, каб схапіць. Мне страшна, але ўцякаць няма куды. А ён падышоў бліжэй, прыглядзеўся і кажа: «Ах, гэта ж наша Антонаўна. Ну, прабач, што напалохаў». І пайшоў сваёй дарогай.

Працы маладому фельчару хапала. Бывала так, што па трое родаў за ноч даводзілася прымаць. Але, нягледзячы на ўласную стомленасць і час сутак, Надзея Антонаўна, як і належыць сапраўднаму медыку, ніколі нікому не адмовіла ў дапамозе. Хапала ў яе практыцы і кур'ёзных выпадкаў.

— Неяк выклікалі мяне да хлопчыка Андрэя Масюка (дзіўна, але Надзея Антонаўна памятае імёны ўсіх сваіх пацыентаў), у якога быў моцны кашаль. Я прыйшла да яго, дастаю фанендаскоп, каб паслухаць, а ён: «А што гэта такое?». Я яму адказваю: «Калі будзеш зараз правільна дыхаць, гэтай трубачкай я пазбіраю ў свае вушы тваю хваробу, а потым выйду за парог і выцерушу яе ў снег». Паслухала яго, прызначыла неабходнае лячэнне. Хлопчык хутка папраўіўся і зноў давай студзёную ваду піць. Маці на яго крычыць, што зараз зноў захварэе, а ён ёй спакойна адказвае: «Нічога страшнага, прыйдзе Антонаўна, пазбірае сваёй трубкай мой кашаль, а потым і выкіне яго на двары», — з усмешкай расказвае Надзея Мартынюк.

— Ой, каб вы толькі ведалі, як яна заўсёды перажывала за сваіх пацыентаў, — умешваецца ў размову муж Надзеі Антонаўны. — На чым ёй за сваю практыку толькі не даводзілася іх перавозіць. Трэба было — везла на гусенічным трактары ці грузавой машыне, магла нават цягнік спыніць.

Антонаўна, так яе пяшчотна называюць вяскоўцы, даўно ўжо на пенсіі, але «калі», «дзе», «каму» ў вёсцы спатрэбіцца неадкладная дапамога, — заўсёды звяртаюцца да яе. А былы фельчар з задавальненнем і артэрыяльны ціск памерае, і пры неабходнасці ўкол зробіць. Любяць «нашу Антонаўну» і дзеці, для якіх у жанчыны заведзены спецыяльны сшытак з мудрагелістымі загадкамі. І хаця тых загадак у сшытку больш за сто, Надзея Мартынюк з лёгкасцю разгадвае кожную, бо яна сама таксама ёсць адгадка, праўда, на загадку жыццёвую: «Без чаго не бывае шчасця чалавеку?»

— Без дабрыні, вядома.

**Аляксандр АЛЕСІК.**
**Фота аўтара.**

На заметку

### НЯПРАВІЛЬНЫ СОН ПРЫВОДЗІЦЬ ДА АТЛУСЦЕННЯ

Вынікі найноўшага даследавання паказалі, што аптымальная працягласць сну для дарослага чалавека — сем-восем гадзін. Навукоўцы прыйшлі да высновы, што атлусценне і іншыя праблемы часцей з'яўляюцца ў тых, хто не мае здаровага сну. Здароўю шкодзіць як вельмі доўгі сон, так і яго недахоп. Гэта даследаванне разам з тым звязвае курэнне з недастатковым сном, а ўжыванне спіртных напояў — з недастатковай фізічнай актыўнасцю. Не браліся пад увагу іншыя фактары, такія як дэпрэсія, якая можа выклікаць пераяданне, бяссонніцу, курэнне і іншыя праблемы.

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

**АБАНЕМЕНТ** на газету ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання)

Колькасць камплектаў

на 2009 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму (прозвішча, ініцыялы)

Куды (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

**ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА** на газету (індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт: падпіскі ________ руб.; пераадрасоўкі ________ руб. Колькасць камплектаў

на 2009 год па месяцах

| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | | | |

Каму (прозвішча, ініцыялы)

Куды (адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

## «БЕЛАРУСКІ ДОМ» У ЛОДЗІ

У Польшчы створана новая арганізацыя «Беларускі дом», асноўнымі мэтамі якой стануць падтрымка і прэзентацыя беларускай культуры. Гэта была важная, але не адзіная падзея падчас Дня беларускай культуры, які прайшоў у Лодзінскім клубе настаўнікаў. Адкрылася чарговая выстаўка жывапісных твораў маладых беларускіх мастакоў В. Пешкуна, Г. Сілівончык, Т. Грыневіч і І. Дударавай, якія дагэтуль дэманстравалі свае працы ў Гданьску і Беластоку. З канцэртнай праграмай выступіў народны ансамбль «Славяначка» Слонімскага Дома культуры.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

Наш культурны асяродак
# Жырандоля
Выпуск № 4 (50)

# КУЛЬТУРА РАЗАГРАЕ СЭРЦЫ

**Антаніна Шаркова кіруе аддзелам культуры Магілёўскага гарвыканкама ўжо дзесяцігоддзе. Увогуле ў гэтай сферы яна працуе амаль 30 гадоў. Яна называе сябе паўжартам «культурнай чыноўніцай» і лічыць сваёй галоўнай задачай так арганізаваць культурнае жыццё Магілёва, каб стварыць яго жыхарам добры настрой на пераадоленне жыццёвых цяжкасцяў.**



Фота Ірыны САВОСІНАЙ.

### Актуальныя бібліятэкі

— Мы толькі што падвялі вынікі працы за мінулы год. Прэзентацыя называлася «Імгненні культуры»

***— І што з гэтых імгненняў вы лічыце поспехам?***

— Летась у Магілёве быў добра выкананы бюджэт, і нам падкідвалі грошай. У першую чаргу мы выдаткавалі сродкі на гарадскія бібліятэкі. Працяглы час прыярытэт у сферы культуры аддаваўся музычным школам. Яны найбольш на вачах: канцэрты і конкурсныя ўзнагароды выхаванцаў. А бібліятэкі хто бачыў? Быў такі перыяд у гісторыі нашага горада, калі дагутарыліся да таго, што нібыта і не патрэбны нам бібліятэкі.

***— Магіляўчане з такім меркаваннем не пагадзіліся.***

— А новы дырэктар сістэмы бібліятэк Галіна Краўчанка добра зразумела прынцып: бюджэтныя грошы проста так не раздаюць. Зрабі творчы праект і пераканай, што гэта сапраўды патрэбна людзям. Нашы бібліятэкі здолелі паказаць кіраўніцтву горада, што камп'ютары і інтэрнэт ніколі «жывую» кнігу не заменяць.

У сістэме летась стварылі гарадскі інфармацыйна-ідэалагічны цэнтр і аб'явілі адкрыты конкурс на сучасную публічную бібліятэку. Конкурс выйграла цэнтральная бібліятэка, якая дасюль носіць імя Карла Маркса. На атрыманыя грошы зрабілі рамонт і мадэрнізацыю, таму што якімі б сучаснымі ні былі праекты, а ў абадраным інтэр'еры наўрад ці імі хто будзе цікавіцца.

### Любімы горад

***— Як вы лічыце, Магілёў — культурны горад?***

— Так, ён канцэртны і тэатральны. Я хаджу на канцэрты і спектаклі, бачу публіку і яе рэакцыю. Нядаўна ў Магілёў прыязджалі салісты оперы з Мінска: поўны аншлаг, прымалі артыстаў з захапленнем, атмасфера цудоўная. Магіляўчане вельмі любяць таксама балет і аперэту.

Аднак трэба ўлічыць, што музычныя густы ў 360 тысяч жыхароў горада розныя. І на нядаўнім канцэрце спевака шансона таксама быў аншлаг, і нягледзячы на прыстойныя кошты білетаў, у апошнія дні мы вытрымлівалі атакі людзей, якія рваліся на канцэрт.

Магілёў — вядома, не сталіца, але культурны абласны цэнтр.

***— У вашых словах адчуваецца гордасць за родны горад. Вы нарадзіліся ў Магілёве?***

— Я родам са Шклоўшчыны, але шмат гадоў жыву ў абласным цэнтры. Аднойчы да мяне прыехала маці і сказала, што Магілёў — непрыгожы горад. Мяне гэта пакрыўдзіла, але я разумела, што яна сказала праўду.

Толькі апошняе дзесяцігоддзе ўлады сталі як мае быць займацца горадам — каб ён быў для людзей і каб не было сорамна перад гасцямі. Мы гэтага дасягнулі, цяпер расійскія гарады-пабрацімы бяруць з нас прыклад у добраўпарадкаванні.

Праца і ініцыятывы гарвыканкама даюць плён. У жыхароў выхоўваецца любоў да роднага горада. Гэта відаць на масавых святах: калі на плошчы людзі скандзіруюць «Магілёў!» на фоне феерверка — гэта захапляе.

### Мэр у вобразе пірата

— Калі кіраўніцтва горада талковае і хоча нешта рабіць для людзей, гэта натхняе на працу. Шэсце Дзядаў Марозаў, пленэр па каменных скульптурах, карнавал на свята горада — гэта культурныя ідэі ўлады.

***— Цяжка было ўвасобіць іх у жыццё арганізатарам упраўлення культуры?***

— Калі шчыра, я супраціўлялася карнавальнаму шэсцю. Казала, што гэта не наш менталітэт, людзі не прывучаныя... Але старшыня гарвыканкама Віктар Шорыкаў настаяў, мы зрабілі — і атрымалася відовішча.

Так, на Захадзе няма аддзелаў культуры, там людзі самі робяць строі, апранаюць іх і на адзін дзень горад становіцца сярэднявечным. Я была ў балгарскім Габраве: там мэр быў на карнавале піратам, а яго супрацоўнікі сталі світай марскога разбойніка.

***— Ці магчыма ў нас такое?***

— І мы да гэтага прыйдзем. Сёння мы абвяшчаем у горадзе конкурс на лепшы карнавальны касцюм, і зацікаўленыя людзі прыходзяць са сваімі ідэямі. Няхай іх пакуль толькі паўсотні з тысячы, але яны — энтузіясты, ім гэта падабаецца. Чалавека нельга прымушаць, ён павінен адчуваць кайф, калі ідзе ў шэсці. Інача свята не будзе.

### З канапы — на баль

***— А вы адчуваеце кайф ад таго, што ўсё гэта арганізоўваецца?***

— Безумоўна. Гэта незвычайныя пачуцці, калі ўсё ўдаецца.

***— А які з апошніх культурных праектаў атрымаўся?***

— Калядны баль. Ваша газета пісала пра яго. Скажу, што ідэя нарадзілася ў межах фестывалю «Магілёўскія святкі». Вядома ж, на Каляды па царкоўна-народным звычаі нельга нічога рабіць.

***— Наўрад ці гэта магчыма ў сучасным свеце. Мы вымушаныя працаваць, мала зважаючы на святы і народныя звычаі...***

— Так, але застаюцца доўгія зімовыя вечары. І хаця мы найбольш сядзім на канапах і глядзім у тэлевізары, але маем патрэбу ў зносінах. Не ўсе працуюць, як вы і я — штодня новыя людзі. Калі нам выпадае вольная гадзіна...

***— ...я хутчэй збягаю ў сваю спакойную «норку»...***

— ...і з кніжкай.

***— Адкуль вы ведаеце?***

— Сама такая. Але зразумейце, што шмат людзей жыве толькі па адным маршруце: «Працадом». Руціна: кабінет і кватэра, кожны дзень падобны на іншы. А хочацца публічнасці і свята. Выйсці ў прыгожым вечаровым строі і прыгожа бавіць час з іншымі людзьмі.

***— І таму — баль?***

— Так. Дамы і кавалеры танцуюць вальс! Гэта ж незвычайнае ўражанне! І тым самым мы адраджаем прыгожыя традыцыі мінулых стагоддзяў. Сёлета прыйшла толькі палова ад запрошаных. Але дзякуючы прэсе пайшлі пагалоскі, і баль будзе папулярны. У тым ліку і ў моладзі.

### Клубная моладзь

— Я вельмі заклапочана тым, што ў сферы культуры мала робіцца для моладзі.

***— Праўда? А мне падавалася, што навокал хапае дыскатэк і начных клубаў. Трэба толькі ўключыць музыку ў цёмным памяшканні — і дастаткова.***

— Гэтага недастаткова. Вось цяпер у Магілёве пабудуюць скейтгарадок, і гэта вельмі добра.

***— На скейты ўсе не стануць, гэта досыць складана.***

— Трэба, каб маладыя людзі збіраліся, аб'яднаныя любімай справай. Мне падабаецца Рыцарскі клуб, трэба даць месца прыхільнікам вакальна-інструментальнай музыкі. Любое захапленне, хобі адцягвае ад п'янак і дурных схільнасцяў.

Я — прыхільніца клубнага руху, таму што люблю незаарганізаваныя мерапрыемствы, калі не трэба па разнарадцы забяспечваць публіку. Трэба, каб чалавек сам хацеў прыйсці і ўбачыць.

У нас нядаўна былі Сіманаўскія чытанні. Я вельмі сумнявалася, што прыйдзе дастаткова людзей. Але зала Беларуска-Расійскага ўніверсітэта была поўная зацікаўленых слухачоў. Перад такой аўдыторыяй хочацца выступаць. Тады ёсць узаемнае задавальненне.

### Культурныя людзі

***— Падаецца, што цяпер народ імкнецца больш да шумных святаў, чым ціхіх клубных пасядзелак. Але натоўп на масавых мерапрыемствах у не такіх аптымістаў, як вы, можа выклікаць іншыя пачуцці. П'яныя твары, гучная лаянка, бутэлькі ў руках і смецце на вуліцах — гэта, прабачце, мала падобнае на культурны горад. Толькі не крыўдуйце за такія словы.***

— Гэта праблема не толькі нашага горада. І ў замежжы пасля святаў застаецца смецце. Але не трэба аднабакова ацэньваць культмасавыя мерапрыемствы. Гэта яшчэ радасць, весялосць і забавы для людзей розных узростаў і сацыяльных слаёў.

Але ў масавым сэнсе сапраўды культуры не хапае. Ва ўсім. Вы толькі паглядзіце на стасункі пешаходаў і вадзіцеляў. А культура ежы і піцця? І пачынаецца гэта ў сям'і, дзе ў дзіцяці павінны выхоўваць культуру паводзінаў. Але і асяродак уплывае на культуру чалавека.

> **У Магілёве летась правялі больш за 3000 культурна-масавых мерапрыемстваў. З іх — больш за 200 тэатралізаваных святаў і абрадаў, 600 тэматычных канцэртаў і спектакляў.**

***— І калі вы ствараеце ў горадзе культурны асяродак, то гэта павінна паўплываць на агульны ўзровень культуры?***

— Спадзяюся, што так. Чысты горад з цягам часу адвучыць людзей пляваць і кідаць акуркі. Як бы яшчэ выкараніць у людзей пераканanne, што калі гэта не мае асабістае, то нічыйнае, а яго можна нішчыць і псаваць?

Я мяркую, што некалі людзі падумаюць пра сваіх дзяцей і ўнукаў, якія будуць тут жыць. Без патэтыкі, а практычна. Што тут будзе прыемны куток, і мая ўнучка прыйдзе пасядзець на гэтай лаве пад дрэвам у спякотны дзень. Мае дзеці жывуць тут, і я так думаю.

### Фабрыка настрою

***— Вашы дзеці пайшлі ў сферу культуры?***

— На жаль, не.

***— Чаму — на жаль?***

— Таму што я вельмі люблю сваю працу. Лічу яе добрай, нават прыгожай. Дачка мае акцёрскія і рэжысёрскія здольнасці, але вырашыла пайсці ў банк.

***— Можа, яна проста правільна зразумела: сфера культуры залежыць ад фінансавання.***

— Проста вырашыла, што фінансіст — гэта больш надзейная прафесія. Многія людзі ставяцца пагардліва да маёй працы: маўляў, што ў вас там — танцы-спевы, не разумеюць яе сутнасці.

***— А ў чым яна?***

— Сфера культуры — гэта як цэлая фабрыка, якая стварае людзям настрой. Можна і не памерці без нармальнага настрою, але патануць у дэпрэсіі цалкам магчыма. Мы разаграём сэрцы, дапамагаем адолець жыццёвыя цяжкасці.

***— Калі зноў пра цяжкасці і грошы, то скажыце, калі ласка, ці ўмяшаўся ў вашу працу крызіс?***

— Так. Нам таксама давядзецца эканоміць. Мы гэта і ўмеем рабіць. Крышку скароцім колькасць мерапрыемстваў, але не апусцім планку. Абавязкова будзем адзначаць дзяржаўныя і традыцыйныя святы.

### Хрысціянская культура

***— У ліку апошніх будзе Міжнародны фестываль духоўнай музыкі «Магутны Божа»?***

— Будзе, але давядзецца быць больш сціплымі. Ведаеце, «Магутны Божа» — гэта як маё дзіця, якому споўнілася ўжо 16 гадоў. Яно добрае і таленавітае, але чамусьці іншыя яго не вельмі заўважаюць. І мне крыўдна, калі шчыра.

Фестываль пачыналі энтузіясты, падхапілі прафесіяналы ў справе культуры, але яму не хапае падтрымкі міністэрства — каб развівацца і стаць яшчэ больш папулярным.

Духоўная музыка, напісаная вялікімі кампазітарамі, падабаецца людзям і адкрывае ў іх новыя добрыя пачуцці. Фестываль добра ведаюць і любяць у Беларусі і за яе межамі. А як вам падаецца, ці варта яго працягваць?

***— Варта. На мой погляд, фестываль грунтуецца на вельмі каштоўнай ідэі для нашай поліканфесійнай краіны — мірнага суіснавання розных хрысціянскіх канфесій.***

— Безумоўна. На канцэртах гучалі праваслаўныя песнапенні, каталіцкія гімны і пратэстанцкія спевы. Ці такое прымірэнне не слушнае?

***— Дык будзем спяваць разам!***

— Цяжка сказаць, што будзе далей. Ці будзе гэта адзін цяжкі год, а мо, не давядзі Божа, і два. Але ж неяк павінны пераадолець. Хаця я не палітык і не бяруся рабіць прагнозы. Але нават калі будзе перапынак у фестывалі, калі людзям гэта патрэбна — «Магутны Божа» вернецца абавязкова.

### Наш прыярытэт

***— Якія вашы надзеі на будучыню?***

— Хочацца захаваць усе клубныя фарміраванні і не страціць калектывы, якія ствараліся карпатлівай працай шмат гадоў. Калі давядзецца зацягнуць паясы, то будзем эканоміць на мерапрыемствах, а не ліквідаваць гурткі.

Мая мара — каб у горадзе з'явілася новая вялікая канцэртная зала, дзе б мы маглі прыняць «зорку» любога ўзроўню і дзе б камфортна адчувалі сябе гледачы.

Вядома ж, хочацца, каб культура стала ў адзін рад разам з іншымі прыярытэтамі для краіны і нашага горада. Тым больш, што мы — першапраходцы. Спачатку запускаюць культуру, а потым ідуць дамаўляцца пра эканамічныя і гандлёвыя стасункі.

Я вельмі хачу, каб Магілёў стаў культурным горадам — у поўным сэнсе гэтага слова. Ён і цяпер не глухая правінцыя. Я вельмі паважаю Магілёў і яго жыхароў. Я працую ў гэтым горадзе і стараюся для яго.

**Гутарыла Ілона ІВАНОВА.**

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

# Ручнічкі ў дарожку

Фігурай нумар адзін у «Бульбянай» — невялікай нават па мястэчковых мерках кавярні, побач з новай аўтастанцыяй — бясспрэчна, была буфетчыца Зінка-сяміручка.

Даўно не дзеўка; праўда, і да пенсіі ёй, як меднаму кацялку да дзіркі, — словам, кабеціна. Маладзіца-ягадзіца. Вось хіба што не кожнаму нашаму палешуку гадзіцца: задужа-такі рослая, завельмі мажная баба. І без таліі, без шыі. А грудзі — во-о, гарбузякі, па пуду з гакам, што ў той скульптуры. На вялікага, скажу я вам, любіцеля. Вочы ў Зінкі — не менш знакавыя. Не, не вялікія, а, так бы мовіць, выразна-ўчэпістыя, колеру лазовай карыцы, і з лёгкім снайперскім прыжмурам. Зіркне — нібы прыцэліцца: маўляў, а ці варты ты маёй увагі, ці трэ мне да цябе падысці?

Заўважце: не паспяшацца, не падбегчы, не падляцець, а падысці. Зінка, яна тое часта падкрэслівае таварышкам, сваё адбегала на ўсе сто працэнтаў. Па маладосці. Калі, дурная, па паўсутак батрачыла афіцыянткай. І ў кавярні, і ў рэстаране. Цяпер яна — ветэран раённага камбіната грамадскага харчавання і фігура нешараговая — буфетчыца. Трымалася Зінаіда Адамаўна адпаведна — годна. Хадзіла няспешна, паважна. Як тлустая восеньская качка. Валюхаючыся. Ад прылаўка — да вагаў, ад вагаў — да мернай шклянкі, якой налівае наведвальнікам буфета віно, каньяк, гарэлку...

Амаль казачная мянушка «сяміручка» да Зінкі прыстала ваўчком з часоў яе афіцыянцтва. За ўменне вокамгненна аблічыцьабскубаць і самага скнапнага кліента: адліць, неданесці, абважыць, упісаць-неўпісаць у рахунак. Па маладосці Зінка любіла каўцянуць, але не абы-якога смуроду, — піла толькі каньячок. Пад лімонную скібку.

Пераборлівай была і ў любошчах. Таму ў афіцыянтках прабегала адносна нядоўга — да свайго саракагоддзя, і замуж выйшла. Стаўшы за стойку буфета, Зінка набрала поўныя абароты.

Грошы ў панчоху не хавала: савецкія вялікія рублі ў цыганоў мяняла на жоўценькія і маленькія царскія «капейкі». І будавалася. Тут усім запраўляў муж, галоўны інжынер БМУ. Што завозілася і рабілася за так, што за трэць цаны... Калі пажаніліся сыны, бацькі (Зінка!) падаравалі кожнаму па кватэры: старэйшаму — у Віцебску, малодшаму — у Гродне. Хай жывецца і вядзецца! Па-буйному ніколі не залятала. Калі і здараліся якія непрыемнасці, напрыклад, з падачы абласных ці рэспубліканскіх кантралюючых органаў, то заўсёды знаходзіўся заступнік, абаронца, апякун.

...У самы росквіт Зінчынай кар'еры я, тады малады і нежанаты, двойчы на дні забягаў у «Бульбяную», каб паабедаць і павячэраць. Персанал мяне добра ведаў, тым больш, што і прафесія была публічная — працаваў карэспандэнтам мясцовай раёнкі.

Аднойчы, напрадвесні, наведваюся ў кавярню, і не адзін — ці не ўсёй рэдакцыяй. На дранікі. Пад вэнджаных таўсталобікаў і «Жыгулёўскае». Наведвальнікаў было нягуста, таму нашы расселіся без праблем. Хто — пасярод залы, хто — бліжэй да вокнаў, а мяне Вікенцій, сябра, пацягнуў ажно ў першую з чатырох «кабін», што месціліся ў якім метры ад краю прылаўка буфета. Так блізка пад пільнае Зінчына вока я ніколі раней не садзіўся, заўсёды выбіраў самы далёкі столік. «Не бяры ў галаву! — падмігрнуў Кеша. — Затое нам першым піўко паднясуць. А Зінцы тваёй праз хвіліну стане не да зыркання па зале — вунь, секані ў акно, паў-Турава прэ сюды з двух «Ікарусаў»... І ўсе ў буфет, і ўсе па ваду ці піва!» Замовілі па тры куфлі піва, дранікі, смятану і пачалі няспешна, пакуль відэльцамі, калупаць вэнджаных таўсталобікаў, якімі раніцою аддзячыў-падахвоціў газетчыкаў новы дырэктар рыбгаса «Чырвоная зорка»: «Малайцы, дабрэнны артыкул напісалі. А як калектыў зварухнулі, узбадзёрылі, настроілі...Часцей завітвайце!..»

Між тым, ля буфета расла і расла чарга. Мне яна нагадвала пальцам піханую вяхляста-закручаную кілбасіну на бляссе, толькі жывую, гаманкую, калючую.

— Буфетчыца! Таварыш буфет...буф.. Ды не піхайцеся вы ў зад...Бу...фетчыца! Мне — «Бураціна» і «Космас», калі ласка...

— Якой табе, ёлы-палы, «Бураціны»? Нахалюга гарадская! Ты, перш-наперш, у чаргу стань, стань, як усе нармальныя людзі стаяць... Думаеш, калі з дыпламатам і пры гальштуку, то і без чаргі? Начхальнічкі... Ра-а-на вы павыходзілі з народа!..

— Дай енваліду пралезці, енваліду дай... Мне два піва без рэшты!..

— Гаўна табе на лапаце, а не піва!.. Інвалід! Насасаўся, як падла, пад той Новы год, ды пальцы на руках і нагах паадмарожваў... Навучыся піць!

— Зінульчык, радасць наша! Давай усім, але строга па чарзе...

— І прапусціце мяне!.. Ды прапусціце, я кажу, хіба не бачыце, я з дзіцем... Нам... аднае вадзічкі купіць!

...Між тым, буфетчыца — нуль на масы: нікому і нічога не збіралася даваць. Яна цалкам сканцэнтравалася на пераліванні нечага з адной бутэлькі ў другую. Ці не крамную, танную, гарэлку ўжо сярод белага дня пералівае Зінка-сяміручка ў сваю, праштампаваную тару? Аперацыя няхітрая, а толькі за адзін вечар можна пакласці ва ўласную кішэньку і месячны заробак шахцёра. Кліентаў — процьма, з раніцы да ночы: кавярня мяжуе з аўтастанцыяй.

— Будьте так любезны, уважаемые!.. Мне бы только кружечку пивка... Жара, сами понимаете... А ехать еще так далеко...

— О! Другі хітразроблены ў гальштучку...

— Но, граждане, уважаемые, я же на минский автобус!.. Вон он стоит у перрона... Через три минуты начнется посадка...

— Калі позніцеся, то — ручнічком дарожка! І няма чаго людзей мне тут баламуціць...

Зінчын галасок я пазнаў бы з тысяч: прыкладна такім шторань заспаны пастух наводзіць парадак у даверaным яму статку.

— Вам что, так невыносимо тяжело подать мне кружечку пивка? — не губляў надзеі мінчанін-інтэлігент.

— Падаюць на папярці, паважаны грамадзянін, а я — пад настрой, і толькі па пятніцах, — здаля, ад падсобкі, не паварочваючы галавы, кінула ў адказ Зінка. — І хіба не бачыце: занятая я... Дарэчы, паважаны, а ці не ваш гэта «Ікарус» вырульвае з-пад павеці аўтастанцыі? Бяжыце, мо й падбярэ!

Пасажыра як карова языком злізала.

— Што, збег? То й добра, ручнічком яму дарожка! Бог дасць, пап'е ўжо свайго, сталічнага...

«Шасцёркі» з чаргі падлізліва рагатнулі. Павесялелі і іншыя, бо гаспадыня буфета пачала звінець бакаламі, уключыла касавы апарат.

— Калі ласка, мяне адпусціце? — жаллівa папрасіў Зінку хударлявы пяцідзесяцігадовы мужчына ў спартыўным касцюме і чырвонай бейсболцы. У ім я пазнаў настаўніка фізкультуры з першай школы Івана Пятровіча. — Мінералачкі, калі ласка... З раніцы — на стадыёне, пад такім сонцам... Праз дзесяць хвілін зноў мае ўрокі, вельмі спяшаюся!

Настаўніка большасць людзей з чаргі добра ведала, паважала, таму ніхто не запярэчыў.

Безумоўна, не магла не ведаць таго, хто вучыў абодвух яе сыноў і Зінка:

— А я сілком ля сябе нікога не трымаю. Хто спяшаецца — ручнічком дарожка! Тут вам не крама, і не забягалаўка якая, а культурнае завядзенне — кавярня... І ўвогуле, а чагой-та вы мне тут, ля буфета, утварылі чаргу? Хочаце піва, дык пасядайце культурненька, вунь як тыя людзі, за сталы, зрабіце заказ і афіцыянткі кожнаму паднясуць...

Настаўнік з пунсовым тварам ужо было падаўся на выхад, ды Зінка нязвыкла лагодным голасам яго спыніла:

— Вазьмі, Пятровіч, будзь ласка, сваю вадзічку... І бяжы на ўрокі...Гэта я не пра цябе тут...

Да прылаўка ці не ў пяты раз падлезла жанчына з малым:

— Можна, і нам вадзічкі? З калонкі набрала — дзіця не п'е, хоча салодкай, з газам...

Буфетчыца засяроджана налівала пенны напой, куфаль за куфлем, для адстою. Малы нечакана загаласіў, ды так цыганіста, што Зінка перакрыла піўны кранік і моўчкі падала жанчыне «Бураціну».

Маці з дзіцем адступіліся ад прылаўка.

— Таварыш прадавец!.. Таварыш прадавец!.. Калі ласка, мне два піва! Я па чарзе першы...— гучна, незадаволена нагадаў пра сябе маленькі поўны мужчынка, якога рослая і мажная буфетчыца або ігнаравала, або не заўважала. Хутчэй, другое, бо Зінка ж ніколі не глядзела долу.

— І чаго вы крычыцё, як варона на дождж? Тут кавярня, а не дом глухіх... Хутчэй забірайце сваё пітво і, як у нас кажуць, — спадарожнага ветру, ручнічком дарожка!

— А я нікуды не еду. Вось! — з выклікам азваўся «пакацігарошак» ў сіняй сацінавай кепцы, прыціскаючы да жывата кружкі з півам.

— То й дзякуй Богу. Мне спакайней будзе...

Чарга ўзарвалася рогатам.

...Мы абедалі хвілін сорак. Вікенцій, кінуўшы грызці рыбу, весела падлічваў, колькі разоў Зінка-сяміручка выгукне сваё кароннае «А ручнічком дарожка!»

— Алес капут. Трэба выбірацца на працу. Падсумуй! — прашу сябра.

Атрымалася, што за няпоўную гадзіну Зінка гасцінна праводзіла ў дарогу сваімі ручнікамі трынаццаць пасажыраў. Не скарыстаць такую багатую фактуру — недаравальны журналісцкі грэх!

Праз тыдзень у раёнцы быў надрукаваны мой фельетон «Трынаццаць ручнічкоў у дарогу».

Добра ведаючы гарачы нораў галоўнай герaіні, падпісаўся не сваім прозвішчам, а прыдуманым і прыдуманым: «Мікола Тарасавіч Скорабагацька, транзітны пасажыр».

Маўляў, такі фельетон пра глыбокапаважаную Зінаіду Адамаўну адназначна пісаў не свой, не мястэчковец, а нейкі госць — скажам, чарнігавец, кіевец, а можа, і пінчук, столінец ці гарадчук, — там таксама хапае і Тарасаў, і Міколаў.

...Пасля з'яўлення фельетона Зінка-сяміручка роўна месяц не размаўляла ні з кім з рэдакцыйных і нават друкарскіх работнікаў. Казалі, што яна адразу ж адмяла версію пра міфічнага «пісаку-хахла». Чаму? «Ён бы напісаў па-руску, а напісана — па-беларуску!»

Буфетчыцу чапянула за жывое і прозвішча «псеўдааўтара»: «Скора і багацька... На мае скорыя грошы ўказвае... На хату новую, на машыну...А ён мне іх даў? Пад мяне і не такія капалі — не накапалі!»

Атрымліваючы звесткі ад «агенткі» з «Бульбянай», я думаў: «От, Штырліц, ёлкі-маталкі... Не даўмеўся напісаць тэкст па-расейску!»

Між тым, Зінка настойліва шукала аўтара яе ганьбы мястэчковага маштабу. Яна паабяцала скрынку «Сталічнай» таму, хто падкажа сапраўднага аўтара фельетона: "Дзеці саплівыя, і тыя тыкаюць пальцамі і крыўляюць — «Цёця Зіна! А люцніцком даёшка!»

Прайшоў тыдзень. У чацвер наступнага, перад самым абедам, званок. Людка, афіцыянтка з кавярні, мая «агентка», паведамляе:

— Зінка раніцою ўсім нам сказала, што ведае таго пісарчука. Спакойна так сказала, а пасля на мяне адну доўга-доўга глядзела. Што я? А нічога. У вучылішчы на пераглядах мяне ніхто не перамагаў. Дарэчы, Зінка ўжо даўно нікому не зычыць ручнікоў у дарогу. І з намі стала больш пакладзістая, не такая важная. Ага, як сем бабак пашапталі! Пра дырэктара нашага не шкодзіла б такі ж фельетон!..»

І я зразумеў: мяне прадалі. Нехта з сяброў пакваліўся на Зінчын ганарар. Вядома, Юду буфетчыца мне не засвеціць.

На абед я пайшоў у рэстаран. Адзін.

...А Зінку з таго часу мястэчкоўцы клікалі «сяміручкай з ручнічком».

**Анатоль БІГАЙДАРАЎ.**

*г. Гомель.*

# Калі надыдуць лепшыя часы для палаца Высокага горада?





Векавыя дрэвы.

**Яшчэ два-тры дзесяцігоддзі таму, калі ў Высокаўскім палацы размяшчалася санаторная школа, ён выглядаў цалкам прыстойна. Сведчанне таму — здымкі канца мінулага стагоддзя. Зараз будынак мае выгляд, які нязменна выклікае толькі шкадаванне. Ён па-сутнасці разбураецца. Хаця дзеля справядлівасці трэба сказаць, што пэўныя меры для яго кансервацыі прымаюцца. Але пра гэта трошкі пазней. Паводле прызнання спецыялістаў, палацава-паркавы ансамбль Высокага з'яўляецца адным з лепшых у Беларусі. Сядзіба захавалася ў ранейшых памерах, застаўся і старадаўні парк.**

Высокае — унікальная мясцінка на зямлі. Летапіс расказвае, як на самым пачатку XIV-га стагоддзя спыніўся тут князь Гедымін, зачараваны маляўнічым выглядам ваколіц. Тады Высокае называлі Высокім горадам. А ў Геаграфічным слоўніку Польскага каралеўства так сказана: «Высока-Літоўск ляжыць на ўзвышшах, падзеленых далінай ракі Пульвы, упоперак цячэння якой стаіць запруда, што стварае адзіную камунікацыю ў час вясновых і асенніх паводак. Само месцазнаходжанне горада, палепшанае такімі пабудовамі, як парафіяльны касцёл, капліца святой Барбары, цудоўны палац маёнтка ў шырока раскінутым парку, а паблізу з ім раскошныя пабудовы шпіталя — усё гэта ў акружэнні зеляніны дрэў, якімі абсаджаны дарогі, уяўляе чароўнае відовішча».

У 1494 годзе Высокае атрымала Магдэбургскае права і свой герб. А з сярэдзіны XVII стагоддзя яно становіцца рэзідэнцыяй Сапегаў, другой па значнасці пасля Ружанаў. Дык вось Павел Сапега заклаў тут замак, які акалялі земляныя валы і раўкі з вадой. Прыродныя ручаі сталі асновай для замкавых равоў. На замкавым дзядзінцы ўзвялі драўляны палац, афіцыну, кухню, якія разам з ўязной брамай утварылі вялікі парадны двор. Як і ва ўсіх замкаў таго часу, кампазіцыйная вось завяршалася паркам.

Замак некалькі разоў гарэў: і падчас вайны 1654-1667 гадоў, і ў Паўночную вайну. Але Сапегі адбудоўвалі яго зноў і зноў. Нешчаслівы лёс замка яшчэ раз пацвердзіў пажар 1748 года. Тады ўсё згарэла дашчэнту. Сапегі на некаторы час пераехалі ў Слонім. І зноў знаходзіцца няўрымслівая княгіня Ганна з роду Сапегаў, якая не шкадуе ні сродкаў, ні сілаў, каб падняць з папялішча радавое гняздо. Замак адрадзілі, ды так, што нясорамна было прыняць у ім Станіслава Аўгуста Панятоўскага ды іншых вяльможных гасцей. Ім паказвалі звычайна звярынец, аранжарэю, іншыя славутасці. Але ж ад лёсу... У 1775 годзе кароль Рэчы Паспалітай яшчэ танчыў тут мазурку, але не прайшло і дзевяць гадоў, як замак згарэў зноў. На гэты раз назаўсёды. Ад таго апошняга замка ў парку засталіся руіны брамы. Брама тады была прыгожай з дзвюма вежамі, архітэктар ўрэзаў гэта збудаванне ў замкавы вал вышынёй да другога паверха.

І вось напачатку XIX стагоддзя Палагея Патоцкая, жонка аднаго з Сапегаў, вырашае пабудаваць тут новую рэзідэнцыю. Палац, які стаіць у Высокім і зараз, з'яўляецца тыповым помнікам архітэктуры перыяду класіцызму. Невялікі аднапавярховы палац прамавугольны ў плане, вядома, не выглядаў так раскошна, як былыя замкі. Але галоўным у ім было начынне — інтэр'еры. Салоны і залы мелі ўзорчатыя паркеты, арыгінальныя каміны, крыштальныя жырандолі, мэблю ў стылі Людовіка XV. Сцены ўпрыгожвалі сямейныя партрэты, і найгалоўнейшым сярод іх быў партрэт самой Палагеі. Карціну пісала знакамітая Элізабэт Вігі-Лебрун, якой замаўлялі партрэты еўрапейскія манаршыя асобы ды зкамітасці накшталт лорда Байрана. На карціне Палагея нагадвае грэчаскую багіню Тэрпсіхору, ахоўніцу музы, танцаў, спеваў. Работа называецца «Дзерачынская Тэрпсіхора», бо напісана была ў Дзерачыне, недалёка ад Высокага. Доўгі час нашчадкі Палагеі перадавалі адно аднаму «Тэрпсіхору» як самую дарагую рэліквію.



Палац Патоцкіх.

У доме захоўваліся таксама каштоўныя мастацкія палотны, багаты архіў Сапегаў і Патоцкіх, а таксама бібліятэка ў пяць тысяч асобнікаў. Асноўныя каштоўнасці палац страціў яшчэ ў першую сусветную вайну.

Вялікай славутасцю маёнтка, яго асноўнай фішкай быў парк. Яго заклала Палагея, пазней старанна даглядала яе ўнучка Марыя. Парк захаваўся найлепей з усіх старадаўніх паркаў Беларусі. Амаль поўнасцю захавалася алея конскага каштана, растуць чорная і веймутава сосны, еўрапейская і даурская лістоўніцы, пірамідальныя дубы, клёны, іншыя дрэвы. Гадоў пяць таму адна высокаўская бабулька расказвала аўтару гэтых радкоў, як за польскім часам яе, школьніцу, у парк на экскурсію вадзіла настаўніца. Гэта было заахвочванне за выдатныя і добрыя поспехі ў вучобе. А проста так у парк нельга было трапіць. На жаль, час і людзі не заўсёды шанавалі гэту жамчужыну прыроды, як яна таго заслугоўвала. І галоўнай яе бядой сталі ачысныя збудаванні, узведзеныя недзе ў 60-я гады мінулага стагоддзя акурат пасярод парку. Атмасферу яны надавалі можна ўявіць якую. Тут крыніцы білі яшчэ з часоў сапегаўскіх замкаў. Дык вось сучаснікі, калі ўзяліся ачышчаць, добраўпарадкоўваць парк, знайшлі адну крынічку, пачысцілі яе, абсталявалі. А мясцовы бацюшка асвячаць адмовіўся. Як можна асвячаць ваду, калі пахі кругом, хоць працівагаз надзявай?

Размовы пра рэканструкцыю парку і палаца вядуцца добры дзясятак гадоў. Справа крыху зрушылася з месца, калі былі выдзелены грошы на будаўніцтва новых ачысных збудаванняў. І як паведаміў **старшыня Высокаўскага гарвыканкама Леанід БІРУК**, летась нарэшце новыя камунікацыі ўвайшлі ў строй. Але ад смуроду не так лёгка пазбавіцца. Патрабуюцца новыя інжынерныя рашэнні, над якімі, паводле слоў Леаніда Леанідавіча, спецыялісты працуюць. Летась было выдзелена з абласнога бюджэту 100 мільёнаў рублёў на прэктна-каштарысную дакументацыю па рэканструкцыі парку. Праект ужо гатовы. Патрэбны толькі грошы на яго ўвасабленне.

А палац тэрмінова патрабуе работы ну хоць бы па кансервацыі. Як паведаміў карэспандэнту «Звязды» **галоўны спецыяліст па захаванні гістарычнай спадчыны ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Леанід НЕСЦЯРЧУК**, «сёлета будзе накрыты дах будынка палаца, каб не залівала дажджом, не разбураўся далей. І няхай стаіць да лепшых часоў, якія, будзем спадзявацца, для гэтага палаца хутка надыдуць».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Камянецкі раён.*

# ВЕЧАРЫНКА

Бяседныя песні

Спрадвечны звычай моладзі лёг у аснову песні «Вечарынка» Леаніда Захлеўнага і Уладзіміра Мазго. Перапоўненыя энергіяй, шчырым жаданнем, хлопцы і дзяўчаты неадольна цягнуцца да сустрэч, спатканняў. На вечарынках выяўляецца характар іх стасункаў. Тут і добразычлівы жарт, і вострае слова, і замілаваны позірк ствараюць пачуццёвую атмасферу. А юнацкія заляцанні, непрыхаванае імкненне быць побач улагоджваецца музыкай. Яна ж надае суладнасць агульнаму руху, запрашае на танец, дзе заўсёды прасвятляецца духоўная блізкасць партнёраў.

Гэтак і ў песні «Вечарынка». Як і ў жыцці, тут усё навідавоку: і юрлівыя пачуцці, і прызнанні, і агністая жаноцкасць. А звонкагалосая «Бяседа» — ансамбль народнай музыкі Белтэлерадыё — жыва ўзмацняе духоўную абстаноўку, стварае натуральную сцэнку.

**Верш Уладзіміра Мазго** — **Музыка Леаніда Захлеўнага**

*Вечарынка, вечарынка.*
*За хвілінаю хвілінка*
*Пралятаюць у бяседзе,*
*Як збіраюцца суседзі.*
*Вечарынка, вечарынка.*
*— Пацалуй мяне,*
*дзяўчынка! —*
*Хоча хлопец надзівіцца,*
*Як успыхне маладзіца:*

***Прыпеў:***
*— Ах, Алесь, Алесь!*
*Да мяне не лезь,*
*Адчапіся ад мяне —*
*ты гарачы ўвесь.*
*Запалаю я — пакахаю я,*
*А ў цябе раўніва жонка*
*і ў мяне сям'я.*

*Вечарынка, вечарынка.*
*— Патанцуй са мной, хлапчынка!*
*І патанчыць можна ўволю,*
*І не скардзіцца на долю.*
*Вечарынка, вечарынка*
*Скачуць хлопец і дзяўчынка,*
*Да суседкі заляцацца —*
*Быццам з горачкі катацца!..*

***Прыпеў.***

*Вечарынка, вечарынка.*
*За хвілінаю хвілінка*
*Пралятаюць у бяседзе,*
*Як збіраюцца суседзі.*
*Вечарынка, вечарынка —*
*Пагулянка без супынку.*
*Хлопец дзеўку запрашае*
*І дадому не спяшае.*

***Прыпеў.***

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН.**

# МУЗЕЙ КРЭПАСЦІ ЕДЗЕ Ў ГЛЫБІНКУ

Напярэдадні 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў музей Брэсцкай крэпасці праводзіць акцыю «Брэсцкая крэпасць — дарогамі памяці». Спецыяльная экспазіцыя музея, якая знаёміць з гісторыяй будаўніцтва Брэст-Літоўскай крэпасці, адкрывае новыя старонкі гісторыі Першай і Другой сусветных войнаў, паказвае гераізм і мужнасць абаронцаў крэпасці ў 1941 годзе, — накіроўваецца ў райцэнтры да свайго гледача. Перасоўная выстава ўжо адчыніла дзверы для наведвальнікаў з Бярозы. Яна размешчана ў сярэдняй школе № 2. Асобныя раздзелы экспазіцыі прысвечаны вызваленню Брэста і вобласці ў 1944 годзе, а таксама сучаснаму жыццю мемарыяла. Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» малодшы навуковы супрацоўнік музея Тамара Юрчык, на фотаздымках і відэаматэрыялах дэманструецца больш за 240 экспанатаў. У Бярозе выстава працягнецца да пачатку сакавіка. Потым яна накіруецца ў іншыя райцэнтры вобласці.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

